ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
07.08.2025 № 140

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі»
# для VI–IX класаў устаноў адукацыі,
# якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
# з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння зместу гэтага вучэбнага прадмета ў VI–IX класах устаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана:

для VI класа на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень);

для VII класа на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень);

для VIII класа на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень);

для IX класа на 34 гадзіны (1 гадзіна на тыдзень).

Педагагічны работнік мае права з улікам асаблівасцей арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі, вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і пазнавальных магчымасцей вучняў змяніць колькасць вучэбных гадзін і паслядоўнасць вывучэння матэрыялу ў межах вучэбнага часу, прызначанага для засваення зместу вучэбных тэм. Рэзервовы час дапушчальна выкарыстоўваць для правядзення кантролю ведаў і ўменняў вучняў.

У IX класе дадзенай вучэбнай праграмай прадугледжана 5 гадзін для выніковага абагульнення, якія педагагічны работнік можа выкарыстоўваць для паўтарэння вывучанага матэрыялу і падрыхтоўкі вучняў да выпускнога экзамену па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі» – развіццё асобы вучня ў працэсе яго інтэграцыі ў сучаснае сацыякультурнае асяроддзе Беларусі пры засваенні асноў сістэматызаваных факталагічных і тэарэтычных ведаў, авалоданні спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці з інфармацыяй аб найважнейшых падзеях гісторыі Беларусі са старажытных часоў па першую чвэрць XXI ст., набыцці асобаснага жыццёвага вопыту, неабходнага для паспяховай сацыялізацыі асобы.

4. Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі»:

засваенне асноўных факталагічных і тэарэтычных ведаў аб найважнейшых падзеях развіцця беларускага грамадства са старажытных часоў па першую чвэрць XXI ст.; авалоданне спецыяльнымі спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (прадметныя кампетэнцыі);

фарміраванне вопыту пераўтваральнай і творчай пазнавальнай дзейнасці, развіццё ўменняў выкарыстоўваць засвоеныя веды, уменні, вопыт у вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і жыццёвых сітуацыях (метапрадметныя кампетэнцыі);

фарміраванне асноў нацыянальнай, грамадзянскай, культурнай ідэнтычнасці асобы; выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму (асобасныя кампетэнцыі).

5. У працэсе засваення зместу вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца тлумачальна-ілюстрацыйныя, рэпрадуктыўныя, часткова-пошукавыя (эўрыстычныя), праблемнага выкладу, даследчыя (практычныя) метады. Сярод адпаведных ім форм навучання: гульнявая дзейнасць, арганізацыя вучэбнай дыскусіі, мадэляванне сваіх сацыяльных дзеянняў на прыкладзе паводзін чалавека ў гісторыі.

Рэкамендуемыя віды вучэбна-пазнавальнай дзейнасці: каменціраванае (самастойнае) чытанне, складанне простага (разгорнутага) плана па змесце вучэбнага тэксту; характарыстыка гістарычных падзей (гістарычных асоб) па прапанаваным плане; лакалізацыя гістарычных падзей у часе і прасторы; падрыхтоўка паведамленняў (прэзентацый) пра гістарычныя падзеі і асобы; складанне табліц (схем) з гістарычнай інфармацыяй (інфармацыйных, параўнальных) па прапанаваных або самастойна вызначаных крытэрыях.

Дадзеная вучэбная праграма прадугледжвае правядзенне ўрокаў «Наш край», што дазволіць пазнаёміць вучняў з асаблівасцямі гістарычнага развіцця свайго рэгіёна. Пры вывучэнні краязнаўчага матэрыялу рэкамендуецца выкарыстоўваць гісторыка-дакументальную хроніку «Памяць»; арганізоўваць экскурсіі, паездкі, наведванне музеяў і іншых устаноў, пошукава-краязнаўчую дзейнасць вучняў, праводзіць сустрэчы са знакамітымі землякамі.

Пры вывучэнні тэмы «Нацысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.» у IX класе выкарыстоўваюцца матэрыялы аб генацыдзе беларускага народа, прадастаўленыя Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь, якія размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (https://adu.by).

Выбар метадаў і форм навучання і выхавання, відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вызначаецца педагагічным работнікам самастойна, зыходзячы з мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы і сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

6. Чаканыя вынікі засваення дадзенай вучэбнай праграмы:

6.1. асобасныя вынікі навучання арыентаваны на фарміраванне жыццёвага вопыту, светапогляду, асобаснай і грамадзянскай пазіцыі, каштоўнасных арыентацый асобы. Асобасныя вынікі засваення зместу дадзенай вучэбнай праграмы выяўляюцца ў тым, што вучань:

кіруецца традыцыйнымі каштоўнасцямі, агульнапрынятымі ў сучасным беларускім грамадстве (сям'я і таварыскія адносіны са сваякамі, сяброўства і ўзаемадапамога, верацярпімасць, здароўе і адукацыя);

ідэнтыфікуе сябе як жыхара Беларусі і грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

паважае нацыянальную гістарычную і культурную спадчыну;

усведамляе значнасць сацыяльна адказных паводзін;

праяўляе павагу да чужога меркавання;

6.2. метапрадметныя вынікі навучання выяўляюцца ў тым, што вучань:

самастойна вызначае мэты свайго навучання, аналізуе і карэкціруе іх вынікі;

сістэматызуе і абагульняе змест вучэбнага матэрыялу і робіць на гэтай аснове аргументаваныя вывады;

аналізуе сучасную сацыяльную рэчаіснасць і прагназуе ўласную жыццядзейнасць;

ажыццяўляе пошук, збор, апрацоўку розных крыніц інфармацыі, пераводзіць інфармацыю з візуальнага ў вербальны выгляд і наадварот;

6.3. у адпаведнасці з прадметнымі вынікамі навучання вучням трэба засвоіць найважнейшыя факты, якія характарызуюць гістарычны працэс у цэлым і розныя бакі грамадскага развіцця; найбольш істотныя прычынна-выніковыя сувязі; асноўныя гістарычныя паняцці. Прадметныя вынікі навучання прадстаўлены ў «Асноўных патрабаваннях да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

7. Змест навучання па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» пабудаваны ў адпаведнасці з канцэнтрычным прынцыпам, што прадугледжвае засваенне зместу вучэбнага матэрыялу ў VI–IX класах на падзейна-храналагічным узроўні.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Значэнне ведаў па айчыннай гісторыі. Гісторыя Беларусі – частка сусветнай гісторыі. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. Гістарычныя крыніцы.

## ЗЕМЛІ БЕЛАРУСІ Ў СТАРАЖЫТНЫЯ ЧАСЫ І РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ (7 гадзін)

Найстаражытнейшыя людзі на беларускай зямлі. Прырода беларускіх зямель у старажытнасці. Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі. Засяленне тэрыторыі Беларусі. Заняткі і лад жыцця старажытных людзей.

Перамены ў новым каменным веку. Зараджэнне вытворчай гаспадаркі. Узнікненне жывёлагадоўлі. Першыя земляробы. Узнікненне няроўнасці ў грамадстве. Першыя прыклады мастацтва.

Пачатак выкарыстання металаў на беларускіх землях. Першыя прылады працы з металу. Спосабы здабычы жалеза. Значэнне адкрыцця жалеза. Міфы і рэлігійныя ўяўленні.

Насельніцтва беларускіх зямель бронзавага і жалезнага вякоў. Пранікненне індаеўрапейцаў на тэрыторыю Беларусі. Плямёны балтаў. Асноўныя заняткі. Суседская абшчына і развіццё грамадства.

Рассяленне славян. Паходжанне славян. Шляхі рассялення славян на тэрыторыі Беларусі. Славянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі.

На шляху да дзяржавы. Князі і ваенная сіла. Веча. Племянныя княжанні. Заняткі і вераванні старажытных славян.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

перыядызацыю гісторыі першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі;

асноўныя падзеі ў гісторыі Беларусі старажытных часоў і Ранняга сярэднявечча і іх даты: засяленне тэрыторыі Беларусі найстаражытнейшымі людзьмі, зараджэнне вытворчай гаспадаркі, пачатак выкарыстання металаў, рассяленне на тэрыторыі Беларусі славян;

азначэнні гістарычных паняццяў: стаянка, племя, гарадзішча, князь, дружына, веча, язычніцтва;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: засяленне тэрыторыі Беларусі найстаражытнейшымі людзьмі, зараджэнне вытворчай гаспадаркі, пачатак выкарыстання металаў, рассяленне на тэрыторыі Беларусі славян;

суадносіць год гістарычнай падзеі з стагоддзем, тысячагоддзем, перыядамі развіцця першабытнага грамадства і Сярэднявечча, чытаць і

запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў у гісторыі;

знаходзіць і паказваць на гістарычнай карце: першыя стаянкі чалавека, знойдзеныя археолагамі на тэрыторыі Беларусі; напрамкі засялення людзьмі тэрыторыі Беларусі; напрамкі пранікнення славян на тэрыторыю Беларусі; тэрыторыі рассялення крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: стаянка, племя, гарадзішча, князь, дружына, веча, язычніцтва; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: аб засяленні тэрыторыі Беларусі найстаражытнейшымі людзьмі; прыладах працы, занятках і побыце першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі; рассяленні славян на тэрыторыі Беларусі; развіцці мастацтва на тэрыторыі Беларусі; рэлігійных вераваннях першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: адступленне ледніка – засяленне тэрыторыі Беларусі людзьмі; цяжкія ўмовы жыцця і здабычы прадуктаў харчавання – аб’яднанне людзей у радавыя калектывы; пагроза голаду, ненадзейнасць здабычы ежы шляхам палявання – прыручэнне жывёл; пераход да вытворчай гаспадаркі – большая незалежнасць ад прыроды; выкарыстанне медных і бронзавых прылад працы - павышэнне вынікаў працы людзей; выраб жалезных сякер – з’яўленне падсечна-агнявога земляробства; развіццё земляробства і жывёлагадоўлі – будаўніцтва ўмацаваных паселішчаў (гарадзішчаў); адсутнасць навуковага разумення паходжання ўсяго існуючага – з’яўленне міфаў; з’яўленне дружыны – узмацненне ўлады князя ва ўсходнеславянскім грамадстве; знешняя ваенная небяспека – стварэнне дзяржаўнай арганізацыі;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па прапанаваных крытэрыях, выяўляць агульнае і асаблівае: радавая і суседская абшчына; прысвойваючая і вытворчая гаспадарка;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, глабальную камп’ютарную сетку інтэрнэт (далей – інтэрнэт)

і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэнні асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэнні гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

## ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII ст. (11 гадзін)

Дзяржава ва ўсходніх славян. Перадумовы ўзнікнення дзяржавы. Першыя дзяржавы на беларускіх землях. Месца беларускіх зямель у складзе Старажытнай Русі – агульнай дзяржавы ўсходніх славян.

Полацкае княства (зямля) у X–XI стст. Старажытны Полацк. Пачатак полацкай княжацкай дынастыі. Узмацненне Полацкага княства. Пачатак княжання Усяслава Брачыславіча. Бітва на Нямізе. Найвышэйшы росквіт Полацкага княства.

Полацкая зямля ў XII – першай палове XIII ст. Пачатак раздробленасці Полацкай зямлі. Часовы ўздым Менскага княства. Адносіны паміж Полацкам і Кіевам. Веча ў Полацкай зямлі.

Тураўскае княства. Старажытны Тураў. Адносіны паміж Туравам і Кіевам. Набыццё незалежнасці Тураўскім княствам. Гарады і валасці Тураўскай зямлі.

Беларускія землі ва ўмовах палітычнай раздробленасці. Раздробленасць Полацкай і Тураўскай зямель. Беларускія землі ў складзе Смаленскага і Чарнігаўскага княстваў. Лёс Берасцейшчыны. Узнікненне гарадоў і княстваў у Панямонні.

Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст. З’яўленне крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы. Адбіццё нападаў нямецкіх рыцараў. Саюз Полацка з Ноўгарадам. Мангольскае нашэсце і беларускія землі.

Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель і ўзнікненне гарадоў. Гаспадарчыя заняткі. Данніцкія абавязкі насельніцтва. Узнікненне і развіццё гарадоў на тэрыторыі Беларусі.

Хрысціянства на беларускіх землях. Прычыны прыняцця хрысціянства. Першыя хрысціяне на беларускіх землях. Язычніцтва і

хрысціянства. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы. Вынікі і значэнне распаўсюджання хрысціянства.

Культура беларускіх зямель у Высокім сярэднявеччы. Забудова гарадоў. Каменнае дойлідства і мастацтва. Пісьменнасць. Помнікі пісьменства.

Штодзённае жыццё нашых продкаў у IX – першай палове XIII ст. Паселішчы і жытлы. Адзенне і харчаванне. Старажытны транспарт. Ваенная справа і ўзбраенне. Забавы.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі ў гісторыі Беларусі IX – сярэдзіны XIII ст. і іх даты: узнікненне Полацкага княства, узнікненне Тураўскага княства; першыя ўпамінанні ў летапісах Полацка, Турава, Мінска; княжанне Рагвалода, Брачыслава Ізяславіча, Усяслава Брачыславіча, бітва на Нямізе; набыццё Туравам незалежнасці, княжанне Юрыя Яраславіча; заснаванне Полацкай і Тураўскай епархій, стварэнне крыжа Ефрасінні Полацкай, пачатак раздраблення Полацкага і Тураўскага княстваў;

гістарычныя формы дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі: Полацкае княства (зямля), Тураўскае княства;

азначэнні гістарычных паняццяў: княства, баяры, крыжакі, манголы, дзядзінец, фрэска, берасцяная грамата, летапісы;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Беларусі ў IX – сярэдзіне XIII ст., вынікі іх дзейнасці: Рагвалод, Рагнеда, Ізяслаў, Брачыслаў Ізяславіч, Усяслаў Брачыславіч, Глеб Усяславіч, Юрый Яраславіч, Вячка, Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі;

дасягненні культуры на тэрыторыі Беларусі ў IX – сярэдзіне XIII ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: узнікненне Полацкага княства, узнікненне Тураўскага княства; першыя ўпамінанні ў летапісах Полацка, Турава, Мінска; княжанне Рагвалода, Брачыслава Ізяславіча, Усяслава Брачыславіча, бітва на Нямізе; здабыццё Туравам незалежнасці, княжанне Юрыя Яраславіча; заснаванне Полацкай і Тураўскай епархій, стварэнне крыжа Ефрасінні Полацкай, пачатак раздраблення Полацкага і Тураўскага княстваў;

суадносіць год гістарычнай падзеі з стагоддзем, тысячагоддзем, перыядамі Сярэднявечча, чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў у гісторыі;

знаходзіць і паказваць на гістарычнай карце: першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі, старажытныя гарады на тэрыторыі Беларусі; напрамкі экспансіі крыжакоў ва Усходнюю Прыбалтыку; напрамкі пранікнення заваёўнікаў-манголаў на беларускія землі;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: княства, баяры, крыжакі, манголы, дзяцінец, фрэска, берасцяная грамата, летапісы; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: аб узнікненні першых дзяржаў на тэрыторыі Беларусі; барацьбе паміж полацкімі і кіеўскімі князямі, бітве на Нямізе; супрацьстаянні беларускіх зямель іншаземным заваёўнікам; асаблівасцях гаспадаркі ўсходніх славян; з’яўленні ўсходнеславянскіх гарадоў і іх ролі ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці; распаўсюджванні хрысціянства на беларускіх землях і яго значэнні для беларускіх земляў; помніках культуры на беларускіх землях: Сафійскі сабор у Полацку, Спаская царква ў Полацку, Барысаглебская царква ў Гродне, крыж Ефрасінні Полацкай, берасцяныя граматы;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычыны і наступствы гістарычных падзей: ускладненне грамадскага жыцця, знешняя небяспека – стварэнне моцнай улады, дзяржавы; адсутнасць трывалых эканамічных сувязей, з’яўленне прыватнага землеўладання, узмацненне баярства - распад Полацкай зямлі на асобныя княствы-воласці; абарона Турава ў 1157 г. – здабыццё Тураўскім княствам незалежнасці; пранікненне крыжакоў ва Усходнюю Прыбалтыку – ваеннае сутыкненне з Полацкім княствам; з’яўленне больш дасканалых прылад працы, выкарыстанне цяглавай сілы, пераход да двуполля і трохполля – павышэнне прадукцыйнасці працы; прыняцце хрысціянства – будаўніцтва цэркваў і манастыроў, стварэнне Полацкай і Тураўскай епархій, развіццё пісьменнасці і адукацыі;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па прапанаваных крытэрыях, выяўляць агульнае і асаблівае: Полацкае і Тураўскае княствы, апалчэнне і дружына, язычніцтва і хрысціянства;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказ на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРЫЯД УЗНІКНЕННЯ І ЎМАЦАВАННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (СЯРЭДЗІНА XIII – КАНЕЦ XIV ст.) (6 гадзін)

Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Перадумовы ўтварэння ВКЛ. Міндоўг – першы кіраўнік новай дзяржавы. Барацьба за ўмацаванне дзяржавы.

Узмацненне велікакняжацкай улады. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ. Княжанні Гедзіміна і Альгерда. Барацьба з агрэсіяй крыжакоў. Стараста Давыд Гарадзенскі, князь Андрэй Полацкі.

Княжанне Ягайлы. Крэўская унія і яе значэнне. Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне. Прычыны збліжэння ВКЛ і Польшчы. Крэўская унія і яе ўмовы.

Дзяржаўны лад ВКЛ. Тэрытарыяльны падзел ВКЛ. Дзяржаўны лад і кіраванне. Мясцовыя органы ўлады.

Гаспадарчае развіццё і культура. Сельская гаспадарка і промыслы. Гарады і заняткі іх жыхароў. Архітэктура. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтвы.

Насельніцтва і рэлігіі ў ВКЛ. ВКЛ як шматэтнічная дзяржава. Язычніцтва. Роля праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Пачатак распаўсюджання каталіцызму.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі ў гісторыі Беларусі сярэдзіны XIII – канца XIV ст. і іх даты: утварэнне ВКЛ, Крэўская унія;

гістарычныя формы дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі: ВКЛ;

азначэнні гістарычных паняццяў: ВКЛ, Крэўская унія, прывілей, вялікі князь («гаспадар»), велікакняжацкая (гаспадарская) рада;

імёны гістарычных дзеячаў сярэдзіны XIII – канца XIV ст., вынікі іх дзейнасці: Міндоўг, Гедзімін, Альгерд, Ягайла, Давыд Гарадзенскі, Андрэй Полацкі;

культурныя дасягненні Беларусі ў сярэдзіне XIII – канцы XIV ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей: утварэнне ВКЛ, Крэўская унія; суадносіць год гістарычнай падзеі з стагоддзем, тысячагоддзем, перыядамі Сярэднявечча, чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў гісторыі;

знаходзіць і паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыю ВКЛ у гады кіравання Міндоўга, Гедзіміна, Альгерда, Ягайлы; напрамкі ваенных паходаў вялікіх князёў літоўскіх супраць крыжакоў, ардынцаў; месцы бітваў;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: ВКЛ, Крэўская унія, прывілей, вялікі князь («гаспадар»), вялікакняжая (гаспадарская) рада; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: аб узнікненні ВКЛ; спосабах уключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ; барацьбе ВКЛ з крыжакамі і ардынцамі; прычынах, умовах і выніках Крэўскай уніі; дзяржаўным ладзе і кіраванні ВКЛ, ролі беларускіх гарадоў у сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці ВКЛ, распаўсюджванні каталіцызму на беларускіх землях, помніках культуры Беларусі;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычыны і наступствы гістарычных падзей: развіццё гаспадарчых сувязей, знешняя небяспека – узнікненне ВКЛ; патрэбы эканамічнага развіцця, пошук саюзнікаў у барацьбе з крыжакамі – заключэнне Крэўскай уніі;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказ на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ВКЛ У КАНЦЫ XIV – XV ст. (8 гадзін)

Княжанне Вітаўта. Намаганні Вітаўта па аднаўленні незалежнасці ВКЛ. Знешняя палітыка Вітаўта. ВКЛ на вяршыні магутнасці.

«Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва. Узрастанне небяспекі з боку крыжакоў. Ваеннае супрацьстаянне з крыжакамі. Грунвальдская бітва. Вынікі і гістарычнае значэнне бітвы.

Дынастычная вайна 1432–1439 гг. Змены ў дзяржаўным ладзе. Супярэчнасці паміж групоўкамі феадалаў у ВКЛ. Барацьба за ўладу паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам Кейстутавічам. Казімір Ягайлавіч і яго палітыка.

Знешняя палітыка ВКЛ у другой палове XV ст. Асаблівасці знешняй палітыкі. Адносіны з заходнімі суседзямі. Страта ВКЛ першынства ў «збіранні рускіх зямель».

Развіццё феадальнага грамадства. Сельская гаспадарка. Фарміраванне саслоўяў у ВКЛ. Землеўладанне і землекарыстанне. Сялянскія павіннасці. Пачатак запрыгоньвання сялян.

Развіццё гарадоў. Рост гарадоў і іх насельніцтва. Павышэнне ролі рамёстваў і гандлю. Магдэбургскае права. Гістарычная роля гарадоў.

Этнічнае развіццё беларускіх зямель. Царква і рэлігія. Асаблівасці фарміравання беларускай народнасці. Паходжанне назвы «Белая Русь». Этнічныя меншасці ў ВКЛ. Становішча праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла.

Культура беларускіх зямель у канцы XIV – XV ст. Асноўныя мастацкія стылі. Культавае і абарончае дойлідства. Жывапіс і скульптура. Літаратура.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі ў гісторыі Беларусі ў канцы XIV – XV ст. і іх даты: княжанне Вітаўта, Грунвальдская бітва, дынастычная вайна ў ВКЛ;

азначэнні гістарычных паняццяў: ВКЛ, Рускае і Жамойцкае, Судзебнік, канцлер, чынш, паншчына, шляхта, мяшчане, ратуша, магдэбургскае права, магістрат;

імёны гістарычных дзеячаў Беларусі канца XIV – XV ст., вынікі іх дзейнасці: Вітаўт, Казімір Ягайлавіч;

дасягненні культуры Беларусі ў канцы XIV – XV ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: княжанне Вітаўта, Грунвальдская бітва, дынастычная вайна ў ВКЛ; суадносіць год гістарычнай падзеі з стагоддзем, тысячагоддзем, перыядамі Сярэднявечча, чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў гісторыі;

знаходзіць і паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыю ВКЛ часоў праўлення Вітаўта; напрамкі ваенных паходаў Вітаўта супраць крыжакоў, ардынцаў, месцы бітваў;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: ВКЛ, Рускае і Жамойцкае, Судзебнік, канцлер, чынш, паншчына, шляхта, мяшчане, ратуша, магдэбургскае права, магістрат; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: аб пашырэнні ВКЛ пры Вітаўце, Грунвальдскай бітве і яе значэнні, выніках дынастычнай вайны, значэнні магдэбургскага права, помніках культуры на беларускіх землях, паходжанні назвы «Белая Русь»;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычыны і наступствы гістарычных падзей: узрастаючая небяспека з боку крыжакоў – Грунвальдская бітва; нарастанне супярэчнасцяў паміж буйнымі землеўладальнікамі – дынастычная вайна; рост і ўмацаванне гарадоў – увядзенне магдэбургскага права;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па прапанаваных крытэрыях, выяўляць агульнае і асаблівае: становішча праваслаўнай і каталіцкай цэркваў у XV ст.;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказ на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

Урок «Наш край са старажытных часоў да канца XVст.».

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VII КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ
(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін)

### БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст. (7 гадзін)

Змены ў дзяржаўным ладзе ВКЛ. Сістэма кіравання дзяржавай. Абмежаванне ўлады вялікага князя. Вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ. Узрастанне значэння Паноў-Рады і сойма.

Палітычнае становішча ВКЛ. Узаемаадносіны з Польшчай. Унутрыпалітычная сітуацыя. Барацьба з Маскоўскім вялікім княствам. Абарона ад набегаў крымскіх татараў.

Эканамічнае развіццё. Змены ў сельскай гаспадарцы. Развіццё гарадоў. З'яўленне мястэчак. Рамесная вытворчасць. Гандлёвыя сувязі і віды гандлю.

Змены ў грамадстве. Становішча сялянства. Афармленне мяшчанскага саслоўя. Фарміраванне шляхецкага саслоўя. Духавенства.

Царква і рэлігія. Становішча Праваслаўнай царквы. Каталіцкі касцёл на беларускіх землях. Нехрысціянскія рэлігіі.

Культура беларускіх зямель у першай палове XVI ст. Распаўсюджанне культуры Адраджэння (Рэнесансу). Францыск Скарына – беларускі першадрукар, гуманіст і асветнік. Літаратура. Культавае і абарончае дойлідства. Выяўленчае мастацтва.

Урок абагульнення.

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў першай палове XVI ст. і іх даты: выданне прывілея князя Аляксандра 1492 г., выданне Статута ВКЛ 1529 г.;

азначэнні гістарычных паняццяў: Паны-Рада, сойм, Статут;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Беларусі ў першай палове XVI ст., вынікі іх дзейнасці: Канстанцін Астрожскі, Міхаіл Глінскі, Жыгімонт I Стары, Францыск Скарына, Мікалай Гусоўскі;

дасягненні культуры на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XVI ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей: выданне прывілея князя Аляксандра 1492 г., выданне Статута ВКЛ 1529 г.; суадносіць даты з стагоддзем; чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў гісторыі;

чытаць легенду гістарычнай карты для пошуку інфармацыі на карценых; паказваць: месцы вывучаных ваенных бітваў; новыя гарады і мястэчкі на тэрыторыі Беларусі;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: Паны-Рада, сойм, Статут; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: прывілей князя Аляксандра 1492 г., выданне Статута ВКЛ 1529 г.;

на аснове аналізу тэксту тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: абмежаванне ўлады вялікага князя – узрастанне значэння Паноў-Рады і сойма; змены ў сельскай гаспадарцы - развіццё гарадоў;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па прапанаваных крытэрыях, выяўляць агульнае і асаблівае: становішча розных саслоўяў, становішча праваслаўнай і каталіцкай царквы;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ<br>Ў СЯРЭДЗІНЕ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст. (11 гадзін)

Лівонская вайна. Прычыны і пачатак вайны. Страта Полацка. Ход вайны ў 1564–1570 гг. Паходы Стафана Баторыя. Ям-Запольскае перамір’е.

Утварэнне Рэчы Паспалітай. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінскі сойм. Умовы аб’яднання Польшчы і ВКЛ.

Палітычнае становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Залатыя шляхецкія вольнасці. Намаганні ВКЛ па захаванні самастойнасці. Статут ВКЛ 1588 г.

Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст. Барацьба са Швецыяй. Інтэрвенцыя ў Расію і яе наступствы.

Сельская гаспадарка. Перадумовы аграрнай рэформы. «Устава на валокі» 1557 г. і яе рэалізацыя. Вынікі рэформы. Афармленне прыгоннага права. Феадальныя павіннасці.

Гарадское жыццё. Гарады і мястэчкі. Рамяство. Цэхі і гільдыі. Унутраны і знешні гандаль. Сацыяльныя канфлікты.

Рэфармацыя і Контррэфармацыя. Пачатак рэфармацыйнага руху на беларускіх землях. Асноўныя напрамкі Рэфармацыі. Пачатак Контррэфармацыі. Дзейнасць ордэна езуітаў. Вынікі Контррэфармацыі.

Берасцейская царкоўная унія. Падрыхтоўка уніі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. Распаўсюджанне ўніяцтва. Вынікі і наступствы заключэння уніі.

Культура беларускіх зямель у сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст. Літаратура і кнігадрукаванне. Станаўленне сістэмы адукацыі. Віленская езуіцкая акадэмія. Мастацтва і архітэктура.

Этнічныя працэсы. Фарміраванне беларускай народнасці. Паланізацыя беларускага грамадства і яе наступствы. Распаўсюджанне назвы «Белая Русь». Старабеларуская мова.

Урок абагульнення.

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст., іх даты: Лівонская вайна, падпісанне Люблінскай уніі, аграрная рэформа 1557 г., прыняцце Статута ВКЛ 1588 г. Берасцейскі царкоўны сабор;

гістарычныя формы дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі: ВКЛ ў складзе Рэчы Паспалітай;

азначэнні гістарычных паняццяў: Рэч Паспалітая, Галоўны Трыбунал ВКЛ, рэформа, «валочная памера», валока, фальварак, царкоўная унія;

імёны гістарычных дзеячаў і дзеячаў культуры Беларусі ў сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст., вынікі іх дзейнасці: Стафан Баторый, Леў Сапега, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Спірыдон Собаль;

дасягненні культуры на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: Лівонская вайна, падпісанне Люблінскай уніі, аграрная рэформа 1557 г., прыняцце Статута ВКЛ 1588 г., Берасцейскі царкоўны сабор; суадносіць даты з стагоддзем, чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў гісторыі;

чытаць легенду гістарычнай карты для пошуку інфармацыі на карце; паказваць: месцы ваенных бітваў, месцы заключэння дзяржаўнай і царкоўнай уній, цэнтры рэфармацыйнага і контррэфармацыйнага руху;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: Рэч Паспалітая, Галоўны Трыбунал ВКЛ, рэформа, «валочная памера», валока, фальварак, царкоўная унія; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: прычыны, ход і вынікі Лівонскай вайны; прычыны і ўмовы стварэння Рэчы Паспалітай; дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай; прычыны, умовы і вынікі аграрнай рэформы 1557 г.; прычыны, умовы і вынікі Берасцейскай уніі; фарміраванне беларускай народнасці;

на аснове аналізу тэксту тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: унутраныя і знешнія праблемы ВКЛ – заключэнне Люблінскай уніі, імкненне ВКЛ да самастойнасці – прыняцце

Статута 1588 г., павелічэнне попыту на зерне ў Заходняй Еўропе – аграрная рэформа 1557 г. у ВКЛ, пачатак Рэфармацыі – заключэнне Берасцейскай царкоўнай уніі;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па прапанаваных крытэрыях, выяўляць агульнае і асаблівае: становішча уніяцкай і праваслаўнай царквы, рэфармацыйны рух у Заходняй Еўропе і на беларускіх землях, Контррэфармацыя ў Заходняй Еўропе і на беларускіх землях;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. (9 гадзін)

Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. на беларускіх землях. Паўстанне Багдана Хмяльніцкага і яго ўплыў на беларускія землі. Бітва пад Лоевам 1649 г. Наступствы вайны для Беларусі.

Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. Прычыны і пачатак вайны. Палітыка цара Аляксея Міхайлавіча на беларускіх землях. Працяг баявых дзеянняў. Андрусаўскае перамір’е 1667 г. і завяршэнне вайны.

Асаблівасці развіцця беларускіх зямель у апошняй трэці XVII ст. Наступствы ваенных дзеянняў. Аднаўленне гарадоў і мястэчак. Адраджэнне сельскай гаспадаркі. Паслабленне цэнтральнай улады.

Паўночная вайна 1700–1721 гг. на беларускіх землях. Прычыны і пачатак вайны. Баявыя дзеянні на беларускіх землях. Бітвы пад Галоўчынам і Лясной (1708 г.). Наступствы вайны для Беларусі.

Грамадска-палітычнае жыццё ў першай палове XVIII ст. Унутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у пачатку XVIII ст. «Нямы» сойм 1717 г. Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай. Барацьба магнацкіх груповак.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў першай палове XVIII ст. Гарады і гандаль. З’яўленне мануфактурнай вытворчасці. Сельская гаспадарка. Формы сацыяльнай барацьбы сялянства.

Адукацыя, навука і грамадска-палітычная думка ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. Развіццё адукацыі, навуковых ведаў. Грамадска-палітычная думка. Казімір Лышчынскі.

Літаратура і мастацтва ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. Літаратура. Сімяон Полацкі. Росквіт барока ў архітэктуры і мастацтве. Тэатр і музыка. Францішка Уршуля Радзівіл.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст., іх даты: казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг., бітва пад Лоевам; вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., бітва пад в. Лясная;

азначэнні гістарычных паняццяў: мануфактура, «ліберум вета», батлейка;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст., вынікі іх дзейнасці: Васіль Вашчыла, Сімяон Полацкі, Казімір Лышчынскі, Казімір Семяновіч, Ілья Капіевіч;

дасягненні культуры на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг., бітва пад Лоевам, вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., бітва каля в. Лясная; суадносіць даты з стагоддзем; чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў гісторыі;

чытаць легенду гістарычнай карты для пошуку інфармацыі на карце; паказваць: месцы ваенных бітваў, цэнтры сялянскіх паўстанняў, цэнтры мануфактурнай вытворчасці;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: мануфактура, «ліберум вета», батлейка; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: прычыны, ход і вынікі казацка-сялянскай вайны; прычыны, ход і вынікі вайны Расіі з Рэччу Паспалітай; Паўночная вайна на беларускіх землях; прычыны і вынікі сялянскага паўстання пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы;

на аснове аналізу тэксту тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: выкарыстанне права «ліберум вета» - узмацненне ўплыву магнацкіх груповак.

параўноўваць гістарычныя падзеі па прапанаваных крытэрыях; выяўляць агульнае і асаблівае: мануфактурная вытворчасць у Заходняй Еўропе і на беларускіх землях;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. (6 гадзін)

Эканамічнае развіццё. Пачатак эканамічных рэформ. Гарады і мястэчкі Беларусі. Сельская гаспадарка. Рэформы А.Тызенгаўза. Магнацкае прадпрымальніцтва.

Палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай. Рост палітычнай нестабільнасці. Барская канфедэрацыя. Першы падзел Рэчы Паспалітай.

Спробы палітычных рэформ у Рэчы Паспалітай. «Чатырохгадовы сойм» і яго рашэнні. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

Паўстанне 1794 г. на беларускіх землях. Пачатак і ход паўстання на беларускіх землях. Т. Касцюшка. Я. Ясінскі. Прычыны паражэння паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.

Культура. Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. Дзейнасць Эдукацыйнай камісіі. Развіццё навукі. Палацава-паркавыя комплексы. Прыгонны тэатр. Мастацтва.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі другой паловы XVIII ст., іх даты: падзелы Рэчы Паспалітай, прыняцце канстытуцыі 3 мая 1791 г., паўстанне 1794 г.;

азначэнні гістарычных паняццяў: Канстытуцыя, шляхецкая канфедэрацыя, Эдукацыйная камісія;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Беларусі другой паловы XVIII ст., вынікі іх дзейнасці: Антоній Тызенгаўз, Іахім Храптовіч, Тадэвуш Касцюшка, Якуб Ясінскі, Марцін Пачобут-Адляніцкі;

дасягненні культуры на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: падзелы Рэчы Паспалітай, прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г., паўстанне 1794 г.; суадносіць даты з стагоддзем, чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі; рашаць задачы на лік гадоў гісторыі;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: Канстытуцыя, Эдукацыйная камісія; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу, гістарычнай карты па плане: рэформы Антонія Тызенгаўза; прычыны, ход і вынікі падзелаў Рэчы Паспалітай; прычыны, ход і вынікі паўстання 1794 г.;

на аснове аналізу тэксту тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: знешнепалітычная пагроза – спробы палітычных рэформ – прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г.;

унутрыпалітычны крызіс Рэчы Паспалітай – узмацненне ўплыву Расійскай імперыі – падзелы Рэчы Паспалітай;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

Урок «Наш край у XVI–XVIII стст.».

Выніковае абагульненне.

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VIII КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін, у тым ліку 2 рэзервовыя гадзіны)

### БЕЛАРУСЬ У КАНЦЫ XVIII – СЯРЭДЗІНЕ XIX ст. (12 гадзін)

Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная будова беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Саслоўная палітыка расійскага ўрада. Сацыяльна-эканамічныя змены. Абмежавальныя законы ў дачыненні яўрэяў.

Беларусь у перыяд Айчыннай вайны 1812 г. (2 гадзіны). Сітуацыя ў Беларусі напярэдадні вайны. «План Агінскага». Баявыя дзеянні летам 1812 г. Палітыка французскіх улад і іх ўзаемаадносіны з мясцовым насельніцтвам. Становішча насельніцтва Беларусі ў час вайны. Партызанскі рух у 1812 г. на тэрыторыі Беларусі. Выгнанне напалеонаўскай арміі. Вынікі вайны для Беларусі.

Грамадска-палітычны рух у першай палове XIX ст. Змены ў палітыцы расійскага ўрада (2 гадзіны). Стварэнне і дзейнасць тайных арганізацый у Беларусі: філаматы і філарэты, дзекабрысты, Таварыства ваенных сяброў. Паўстанне 1830–1831 гг. на беларускіх землях і палітыка расійскага ўрада ў беларускіх губернях. Грамадскі рух у 30–40-х гг. XIX ст.

Канфесійныя адносіны. Становішча канфесій у Беларусі пасля далучэння да Расійскай імперыі. Выгнанне езуітаў і абмежаванне ўплыву каталіцтва. Скасаванне ўніяцкай царквы.

Сельская гаспадарка і становішча сялян у першай палове XIX ст. Новыя з'явы ў гаспадарчым жыцці вёскі. Сацыяльна-прававое становішча сялянства. Нормы і формы павіннасцей. Рэформа П. Дз. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы.

Прамысловасць, гандаль, гарады і мястэчкі Беларусі ў першай палове XIX ст. Формы прамысловай вытворчасці і пачатак прамысловага перавароту. Развіццё шляхоў зносін і гандлю. Роля кірмашоў. Гарады і мястэчкі Беларусі.

Адукацыя і навука. Змены ў сістэме адукацыі. Станаўленне навуковых ведаў аб Беларусі і беларускім народзе. П. Шпілеўскі, Я. Чачот, К. і Я. Тышкевічы. Даследаванні М. К. Баброўскага, І. І. Грыгаровіча, І. В. Турчыновіча.

Літаратура і мастацтва. Рамантызм. А. Міцкевіч. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры: паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе»; творчасць Яна Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча. Развіццё мастацтва: В. Ваньковіч, С. Манюшка. Архітэктура.

Урок абагульнення.

Урок «Наш край у канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст.».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст., іх даты: увядзенне мяжы яўрэйскай аселасці, Айчынная вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі; паўстанне 1830–1831 гг. на тэрыторыі Беларусі; рэформы П. Дз. Кісялёва, адмена дзеяння Статута ВКЛ у беларускіх губернях, Полацкі царкоўны сабор;

гістарычныя формы дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі: Беларусь у складзе Расійскай імперыі;

азначэнні гістарычных паняццяў: рэкруцкая павіннасць, мяжа яўрэйскай аселасці, «план Агінскага», аўтаномія, «разбор шляхты», абшчына;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры Беларусі ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст., прыклады іх дзейнасці і творчасці: П. Дз. Кісялёў, П. Шпілеўскі, К. і Я. Тышкевічы, М. К. Баброўскі, І. І. Грыгаровіч, І. В. Турчыновіч, А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч, В. Ваньковіч, С. Манюшка, І. Дамейка;

дасягненні культуры на тэрыторыі Беларусі у канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: увядзенне мяжы яўрэйскай аседласці, Айчынная вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі, паўстанне 1830–1831 гг. на тэрыторыі Беларусі, рэформы П. Дз. Кісялёва, адмена дзеяння Статута ВКЛ у беларускіх губернях, Полацкі царкоўны сабор; рашаць храналагічныя задачы;

выкарыстоўваць легенду гістарычнай карты для атрымання інфармацыі; паказваць на карце: падзеі Айчыннай вайны 1812 г. на тэрыторыі Беларусі, цэнтры эканамічнага развіцця на тэрыторыі Беларусі;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: рэкруцкая павіннасць, мяжа яўрэйскай аседласці, «план Агінскага», аўтаномія, «разбор» шляхты, абшчына; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці; канкрэтызаваць гістарычныя паняцці прыкладамі;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, выкарыстоўваць іх для характарыстыкі вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі, гістарычных асоб з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў: становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі; ход Айчыннай вайны 1812 г. на тэрыторыі Беларусі, дзейнасць філаматаў і філарэтаў, дзекабрыстаў; прычыны паўстання 1830–1831 гг.; развіццё сельскай гаспадаркі і становішча сялянства ў выніку рэалізацыі рэформы П. Дз. Кісялёва; прамысловы пераварот на тэрыторыі Беларусі; канфесійныя адносіны на тэрыторыі Беларусі

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: паўстанне 1830–1831 гг. – правядзенне «разбору» шляхты; узмацненне ўплыву праваслаўя – скасаванне уніяцкай царквы; імкненне да павышэння даходнасці сельскагаспадарчай вытворчасці на дзяржаўных землях – правядзенне рэформы П. Дз. Кісялёва, уключэнне Беларусі ў агульнарасійскі рынак  паляпшэнне шляхоў зносін на тэрыторыі Беларусі;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па прапанаваных і (ці) самастойна вызначаных крытэрыях, выяўляць агульнае і асаблівае,

фармуляваць высновы: палітыка расійскага ўрада да і пасля паўстання 1830–1831 гг.;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце; пераводзіць інфармацыю з вербальна-лагічнай у вобразна-наглядную форму і наадварот;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі з выказваннем уласнага меркавання аб іх значэнні.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

## БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. (19 гадзін)

Адмена прыгоннага права. Абвяшчэнне і ўмовы вызвалення памешчыцкіх сялян. Ажыццяўленне сялянскай рэформы. Вынікі і значэнне рэформы 1861 г.

Паўстанне 1863–1864 гг. Прычыны і мэты паўстання. «Чырвоныя» і «белыя». К. Каліноўскі. «Мужыцкая праўда». Пачатак і ход паўстання, яго падаўленне. Уплыў паўстання 1863–1864 гг. на ўмовы вызвалення сялян беларускіх губерняў.

Урадавая палітыка ў Беларусі ў апошняй трэці XIX ст. Сітуацыя ў беларускіх губернях пасля паўстання 1863–1864 гг. Асаблівасці правядзення буржуазных рэформ у Беларусі. Мерапрыемствы расійскіх уладаў па нацыянальна-рэлігійным пытанні. Заходнерусізм.

Развіццё капіталістычных адносін у вёсцы пасля адмены прыгоннага права. Рост буржуазнага землеўладання ў Беларусі. Становішча сялян. Пераход да прадпрымальніцкай гаспадаркі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.

Прамысловасць і стан гарадоў, развіццё гандлю і транспарту ў 1860-х гг. – пачатку XX ст. (2 гадзіны). Станаўленне фабрычнай вытворчасці. Спецыялізацыя прамысловасці. Асаблівасці прамысловага

перавароту ў Беларусі. Рост гарадоў. Змены ў складзе гарадскога насельніцтва. Гарадская рэформа. Будаўніцтва чыгункі. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю.

Фарміраванне палітычных партый і рухаў. Рэвалюцыйныя народнікі. М. Судзілоўскі. Група «Гоман» і ўзнікненне беларускай нацыянальнай ідэі. Агульнарасійскія сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Беларусі. Утварэнне і праграмныя патрабаванні Беларускай сацыялістычнай грамады (далей – БСГ).

Грамадска-палітычная абстаноўка ў Беларусі ва ўмовах першай расійскай рэвалюцыі (2 гадзіны). Прычыны, пачатак і ход рэвалюцыі. Выступленні рабочых і сялян. Маніфест 17 кастрычніка і яго наступствы для Беларусі. Дзейнасць палітычных партый і рухаў. Дэпутаты ад беларускіх губерняў у Дзяржаўнай думе. Беларускі нацыянальны рух. Газета «Наша Ніва». Палітыка самадзяржаўя пасля паражэння рэвалюцыі 1905–1907 гг.

Сталыпінскія рэформы ў Беларусі. Прычыны і мэты аграрнай рэформы. Разбурэнне сялянскай абшчыны. Пашырэнне хутарской сістэмы землекарыстання. Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расіі. Увядзенне земстваў. Вынікі рэформ для Беларусі.

Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя. Нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва Беларусі. Агульнасць гаспадарчага жыцця. Развіццё беларускай літаратурнай мовы. Нацыянальная самасвядомасць. Развіццё нацыянальнага руху. В. Ластоўскі. Афармленне беларускай нацыянальнай ідэі.

Адукацыя і навука ў 1860-х гг. – пачатку XX ст. Школьная рэформа. Развіццё адукацыі. Навуковыя даследаванні пра мову, этнаграфію беларусаў, гісторыю Беларусі: І. Насовіч, Е. Раманаў, Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, А. Сапуноў.

Беларускія літаратура і тэатр у 1860-х гг. – пачатку XX ст. Развіццё беларускай літаратуры. Ф. Багушэвіч, Янка Лучына, А. Пашкевіч (Цётка), Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. І. Буйніцкі.

Жывапіс і архітэктура ў 1860-х гг. – пачатку XX ст. Жывапіс: Н. Орда, Н. Сілівановіч, Ю. Пэн, М. Шагал, Л. Бакст. Развіццё архітэктуры.

Падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі. Пачатак вайны і настроі ў грамадстве. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Ураджэнцы Беларусі – героі Першай сусветнай вайны. Акупацыя заходняй часткі Беларусі. Становішча насельніцтва Беларусі. Палітыка германскіх улад на акупаванай тэрыторыі. Усходняя частка Беларусі ва ўмовах Першай сусветнай вайны. Бежанства. Беларускі нацыянальны рух.

Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі. Абвастрэнне палітычнай сітуацыі ў Беларусі вясной – летам 1917 г. Заняпад сельскай гаспадаркі. Мілітарызацыя прамысловасці. Звяржэнне самадзяржаўя. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве. Беларускі нацыянальны рух.

Урок абагульнення.

Урок «Наш край у другой палове XIX – пачатку XX ст.».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., іх даты: адмена прыгоннага права, паўстанне 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі; стварэнне групы «Гоман», Курлоўскі расстрэл, стварэнне БСГ; пачатак сталыпінскай аграрнай рэформы, увядзенне земстваў у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай губернях, асноўныя падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі;

азначэнні гістарычных паняццяў: хутар, водруб, земствы; часоваабавязаныя сяляне, «прускі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, «амерыканскі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, нацыя;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры і навукі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., вынікі іх дзейнасці ці творчасці: К. Каліноўскі, М. Судзілоўскі, І. Насовіч, В. Ластоўскі, Е. Раманаў, Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, А. Сапуноў, Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Пашкевіч (Цётка), Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч, І. Буйніцкі, Н. Орда, Н. Сіліванові ч, Ю. Пэн, М. Шагал, Л. Бакст;

дасягненні культуры на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: адмена прыгоннага права, паўстанне 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі; стварэнне групы «Гоман», Курлоўскі расстрэл, стварэнне БСГ; пачатак сталыпінскай аграрнай рэформы, увядзенне земстваў у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай губернях, асноўныя падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі; рашаць храналагічныя задачы;

выкарыстоўваць легенду гістарычнай карты для атрымання інфармацыі; паказваць падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: хутар, вотруб, земства, часоваабавязаныя сяляне, «прускі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, «амерыканскі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, нацыя; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці; канкрэтызаваць гістарычныя паняцці прыкладамі;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, выкарыстоўваць іх для характарыстыкі вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі, гістарычных асоб з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў: аграрную рэформу 1861 г., прычыны і вынікі паўстання 1863–1864 гг.; развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы і прамысловасці; асноўныя падзеі і вынікі расійскіх буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый на тэрыторыі Беларусі; мерапрыемствы і вынікі сталыпінскай рэформы; асноўныя падзеі і наступствы Першай сусветнай вайны; фарміраванне беларускай нацыі;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: паўстанне 1863–1864 гг. – скасаванне часоваабавязанага становішча сялян у беларускіх губернях; адмена прыгоннага права, сталыпінская аграрная рэформа – стварэнне ўмоў для развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі; фарміраванне беларускай нацыі – развіццё беларусазнаўства, афармленне беларускай нацыянальнай ідэі;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па прапанаваных і (ці) самастойна вызначаных крытэрыях; выяўляць агульнае і асаблівае; фармуляваць высновы: «прускі» і «амерыканскі» шляхі развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы; адмена прыгоннага права і ажыццяўленне сталыпінскай аграрнай рэформы ў Расійскай імперыі і ў беларускіх губернях;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце; пераводзіць інфармацыю з вербальна-лагічнай у вобразна-наглядную форму і наадварот;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі з выказваннем уласнага меркавання аб іх значэнні.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі.

ажыццяўлення камунікацыі ў поліканфесійным і полікультурным грамадстве.

Выніковае абагульненне (2 гадзіны).

## ГЛАВА 5
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IX КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ
(1 гадзіна на тыдзень, усяго 34 гадзіны)

### КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў РАСІІ І СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (1917–1921 гг.) (4 гадзіны)

Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі і першыя пераўтварэнні савецкай улады. Пераход улады ў рукі Саветаў. Фарміраванне і дзейнасць органаў савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце. Пазіцыя Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў Заходняй вобласці і фронту (далей – Аблвыкамзах) па пытанні беларускай дзяржаўнасці. Палітыка «ваеннага камунізму».

Спробы дзяржаўнага самавызначэння Беларусі. Скліканне Усебеларускага з’езда і яго рашэнні. Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі. Супраціўленне беларускага народа германскай акупацыі. Брэсцкі мір і яго наступствы для Беларусі. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (далей – БНР). Дзейнасць Рады БНР.

Утварэнне беларускай савецкай дзяржавы. Стварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (далей – ССРБ). І Усебеларускі з’езд Саветаў і яго рашэнні. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (далей – Літбел).

Польска-савецкая вайна 1919–1921 гг. і другое абвяшчэнне ССРБ. Наступленне польскіх войскаў у Беларусі. Ваенныя дзеянні на польска-савецкім фронце. Супраціўленне беларускага народа польскай акупацыі.

Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ 31 ліпеня 1920 г. Рыжскі мірны дагавор і яго наступствы для Беларусі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў 1917–1921 гг., іх даты: падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі; скліканне Усебеларускага з’езда; Брэсцкі мір; абвяшчэнне незалежнасці БНР; стварэнне ССРБ; афіцыйнае афармленне Літбел; польска-савецкая вайна; другое абвяшчэнне ССРБ; Рыжскі мірны дагавор;

нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці: ССРБ, Літбел;

азначэнні гістарычных паняццяў: Брэсцкі мір, «буферная дзяржава», беларуская нацыянальная дзяржава, «ваенны камунізм», нацыяналізацыя, Літбел, Рыжскі мір, харчразвёрстка;

імёны і прозвішчы гістарычных дзеячаў, прадстаўнікоў культуры Беларусі ў 1917–1921 гг., вынікі іх дзейнасці: З. Х. Жылуновіч, А. Р. Чарвякоў;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі, скліканне Усебеларускага з’езда, Брэсцкі мір; абвяшчэнне незалежнасці БНР, стварэнне ССРБ, афіцыйнае афармленне Літбел, польска-савецкая вайна, другое абвяшчэнне ССРБ, Рыжскі мірны дагавор; рашаць храналагічныя задачы;

выкарыстоўваць гістарычную карту для характарыстыкі найважнейшых гістарычных падзей: стварэнне ССРБ; афіцыйнае афармленне Літбел; раздзелы тэрыторыі Беларусі па ўмовах Брэсцкага і Рыжскага міру;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: Брэсцкі мір, «буферная дзяржава», беларуская нацыянальная дзяржаўнасць, «ваенны камунізм», дзяржава, нацыяналізацыя, Літбел, Рыжскі мір, харчразвёрстка; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

выкарыстоўваць фрагменты гістарычных дакументаў для характарыстыкі вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў: падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі і на Заходнім фронце; першыя пераўтварэнні ў сацыяльна-эканамічнай сферы ва ўмовах палітыкі

«ваеннага камунізму»; вынікі Брэсцкага і Рыжскага міру для Беларусі; этапы стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці; этапы фарміравання тэрыторыі Беларусі; асноўныя падзеі польска-савецкай вайны;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: агульнанацыянальны крызіс – пераход улады ў Беларусі і на Заходнім фронце да Саветаў; фарміраванне беларускай нацыі – афармленне яе нацыянальнай формы дзяржаўнасці; адраджэнне Польскай дзяржавы – пачатак польска-савецкай вайны;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па самастойна вызначаных крытэрыях; выяўляць агульнае і асаблівае; фармуляваць высновы: пазіцыі Аблвыкамзаха і Беларускага нацыянальнага камітэта па пытанні беларускай дзяржаўнасці; рашэнні Усебеларускага з’езда і I Усебеларускага з’езда Саветаў; умовы і вынікі Брэсцкага і Рыжскага міру для Беларусі;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце; пераводзіць інфармацыю з вербальна-лагічнай у вобразна-наглядную форму і наадварот;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі з выказваннем уласнага меркавання аб іх значэнні.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі і як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўлення камунікацыі ў поліканфесійным і полікультурным грамадстве.

## БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ (1921–1939 гг.) (6 гадзін)

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (далей – БССР) у гады новай эканамічнай палітыкі (далей – нэп). Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі. Пераход да нэпа. Уплыў нэпа на аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі.

Правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР. Прычыны, асаблівасці і метады правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Вынікі прамысловага развіцця БССР у перыяд першых пяцігодак. Прычыны, метады і асаблівасці правядзення калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР. Вынікі калгаснага будаўніцтва ў БССР у перыяд першых пяцігодак.

Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (далей – СССР). Узбуйненне тэрыторыі БССР у 1924 г. і 1926 г. Фарміраванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. Палітычныя рэпрэсіі.

Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР. Беларусізацыя як састаўная частка савецкай нацыянальнай палітыкі: асноўныя мерапрыемствы і вынікі. Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі і навукі ў БССР. Сталае і маладое пакаленні ў беларускай савецкай літаратуры. Станаўленне беларускага савецкага мастацтва.

Заходняя Беларусь у складзе Польшчы. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця беларускага насельніцтва. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. Стан адукацыі. Літаратура. Жывапіс.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў 1921–1939 гг., іх даты: увядзенне нэпа; пачатак ажыццяўлення індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР, ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, утварэнне СССР, узбуйненні тэрыторыі БССР;

нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці: БССР;

азначэнні гістарычных паняццяў: асаднікі, беларусізацыя; індустрыялізацыя, калектывізацыя, каранізацыя; нэп, паланізацыя; савецкая грамадска-палітычная сістэма, харчпадатак;

імёны і прозвішчы гістарычных дзеячаў, прадстаўнікоў культуры ў 1921–1939 гг., вынікі іх дзейнасці і творчасці: Я. Н. Драздовіч, У. М. Ігнатоўскі, А. Л. Чыжэўскі, О. Ю. Шміт, Б. А. Тарашкевіч, У. І. Пічэта, Якуб Колас, Янка Купала, Кандрат Крапіва, Аркадзь Куляшоў, С. В. Прытыцкі, Максім Танк, Міхась Чарот;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: увядзенне нэпа, пачатак ажыццяўлення індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР, ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, утварэнне СССР, узбуйненне тэрыторыі БССР, вырашаць храналагічныя задачы;

выкарыстоўваць гістарычную карту для характарыстыкі найважнейшых гістарычных падзей: узбуйненні БССР у 1924 г. і 1926 г.; правядзенне індустрыялізацыі ў БССР;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: асаднікі, беларусізацыя, індустрыялізацыя, калектывізацыя, каранізацыя, нэп, паланізацыя; харчпадатак, правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

выкарыстоўваць фрагменты гістарычных дакументаў для характарыстыкі вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў, інфармацыі аб памятных гістарычных мясцінах: вынікі і асаблівасці нэпа ў Беларусі; вынікі і асаблівасці правядзення індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў Беларусі; удзел БССР ва ўтварэнні СССР; грамадска-палітычнае жыццё ў БССР; дасягненні адукацыі і навукі ў БССР; становішча заходнебеларускіх земляў у складзе Польшчы, стан культуры ў Заходняй Беларусі; адлюстраванне гістарычных падзей у творах літаратуры і мастацтва;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі Беларусі – пераход да нэпа; правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў Беларусі – фарміраванне індустрыяльна-аграрнага грамадства; палітыка паланізацыі на тэрыторыі заходнебеларускіх земляў у складзе Польшчы – развіццё нацыянальна-вызваленчага (нацыянальна-культурнага) руху;

параўноўваць вывучаныя гістарычныя падзеі па самастойна вызначаных крытэрыях; выяўляць агульнае і асаблівае; фармуляваць высновы: палітыка ваеннага камунізму і нэп; грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё БССР і заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы; індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў СССР і Савецкай Беларусі;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце; пераводзіць інфармацыю з вербальна-лагічнай у вобразна-наглядную форму і наадварот;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, дасягненнях культуры, гістарычных асобах (дзеячах культуры) Беларусі з выказваннем уласнага меркавання аб іх значэнні.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні мясцін памяці беларускага народа, выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі і як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўлення камунікацыі ў поліканфесійным і полікультурным грамадстве.

## БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ (6 гадзін)

Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Устанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Напад нацысцкай Германіі на СССР. Абарончыя баі ў Беларусі і іх вынікі. Гераізм і самаадданасць абаронцаў Айчыны.

Нацысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. План «Ост». Нацысцкі «новы парадак». Удзел калабарацыяністаў у рэалізацыі акупацыйнай палітыкі нацыстаў на тэрыторыі Беларусі. Генацыд беларускага народа. Беларускія остарбайтары.

Разгортванне народнай барацьбы супраць нацысцкіх акупантаў. Стварэнне і баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Партызанскія зоны. «Рэйкавая вайна». Падпольная барацьба. Супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму.

Вызваленне БССР ад нацысцкіх захопнікаў. Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Удзел БССР ва ўтварэнні Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (далей – ААН). Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Удзел БССР у заснаванні ААН. Захаванне

гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2022 г. № 146-З «О геноциде белорусского народа».

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў 1939–1945 гг., іх даты: пачатак паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, 17 верасня як дзяржаўнае свята Рэспублікі Беларусь – Дзень народнага адзінства; уключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і яе ўз’яднанне з БССР; пачатак Вялікай Айчыннай вайны; 22 чэрвеня як памятная дата – Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа; вызваленне сталіцы БССР г. Мінска ад нацысцкіх захопнікаў; 3 ліпеня як дзяржаўнае свята – Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі); Дзень Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне; 9 мая як дзяржаўнае свята – Дзень Перамогі; падпісанне дэлегацыяй БССР Статута ААН;

азначэнні гістарычных паняццяў: аперацыя «Баграціён», Вялікая Айчынная вайна, генацыд, гета, Халакост, остарбайтары, партызанскі рух, падпольная барацьба, план «Ост», «рэйкавая вайна»;

імёны гістарычных асоб і вынікі іх дзейнасці: І. П. Антонаў, Ц. П. Бумажкоў, Р. У. Дольнікаў, К. С. Заслонаў, М. Казей, Я. У. Клумаў, В. З. Корж, Ф. І. Паўлоўскі, З. Партнова, З. М. Тусналобава-Марчанка, А. М. Усаў, В. З. Харужая, М. П. Шмыроў;

прыклады гераізму воінаў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, сімвалы памяці беларускага народа аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: пачатак паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, уключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і яе ўз’яднанне з БССР, пачатак Вялікай Айчыннай вайны, вызваленне сталіцы БССР г. Мінска ад нацысцкіх захопнікаў, Дзень Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, падпісанне дэлегацыяй БССР Статута ААН; рашаць храналагічныя задачы;

выкарыстоўваць гістарычную карту для характарыстыкі гістарычных падзей: уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР; падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: аперацыя «Баграціён», Вялікая Айчынная вайна, генацыд, гета, остарбайтэры, партызанскі рух,

падпольная барацьба, план «Ост», «рэйкавая вайна»; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

выкарыстоўваць фрагменты гістарычных дакументаў для характарыстыкі вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў: абарончыя баі летам 1941 г. на тэрыторыі БССР; партызанскі і падпольны рух на акупіраванай тэрыторыі БССР; генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, вызваленне БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; уклад беларускага народа ў перамогу над Германіяй; удзел БССР ва ўтварэнні ААН; захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: пачатак Другой сусветнай вайны – уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР; абарончыя баі летам 1941 г. на тэрыторыі Беларусі – зрыў германскага плана «маланкавай вайны»; уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй – удзел БССР ва ўтварэнні ААН;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце; пераводзіць інфармацыю з вербальна-лагічнай у вобразна-наглядную форму і наадварот;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, гістарычных асобах Беларусі з выказваннем уласнага меркавання аб іх значэнні.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні мясцін памяці беларускага народа, выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі і як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўлення камунікацыі ў поліканфесійным і полікультурным грамадстве.

## БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 40-х – 80-я гг. ХХ ст. (6 гадзін)

Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 40-х – першай палове 60-х гг. ХХ ст. Асаблівасці пасляваеннага ўнутрыпалітычнага жыцця ў БССР. Дзяржаўная сімволіка БССР. Змены ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 50-х – першай палове 60-х гг. ХХ ст.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 40-х – першай палове 60-х гг. ХХ ст. Пераадоленне наступстваў вайны ў галіне народнай гаспадаркі. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці. Развіццё машынабудавання і нафтахімічнай прамысловасці. Аднаўленне і развіццё сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі. Умовы жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва.

Грамадска-палітычнае становішча ў другой палове 60-х – 80-я гг. ХХ ст. Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі. Удзел насельніцтва БССР у грамадска-палітычным жыцці. Палітыка перабудовы ў БССР. Фарміраванне шматпартыйнасці.

Сацыяльна-эканамічнае становішча ў другой палове 60-х – 80-я гг. ХХ ст. Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Развіццё сельскай гаспадаркі. Узровень жыцця насельніцтва. Запаволенне тэмпаў росту эканомікі і сацыяльнай сферы і спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для насельніцтва і народнай гаспадаркі Беларусі.

Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў другой палове 60-х – 80-я гг. ХХ ст. Развіццё сістэмы народнай адукацыі. Дасягненні навукоўцаў – ураджэнцаў Беларусі. Беларуская савецкая літаратура. Гістарычны рэпертуар беларускіх тэатраў. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім жывапісе. Гістарычная тэматыка ў беларускім кіно. Музычная творчасць.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі, іх даты: прыняцце Канстытуцыі БССР 1978 г.;

азначэнні гістарычных паняццяў: індустрыяльнае грамадства, перабудова, рэабілітацыя;

імёны грамадска-палітычных і гаспадарчых дзеячаў, прадстаўнікоў адукацыі і навукі, літаратуры і мастацтва Беларусі, вынікі іх дзейнасці і творчасці: К. Т. Мазураў, П. М. Машэраў, А. А. Грамыка, А. Я. Андрэеў, К. П. Арлоўскі, С. Г. Скарапанаў, В. Ф. Купрэвіч, Я. Б. Зяльдовіч,

П. В. Сухі, Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Іван Мележ, Уладзімір Мулявін, Міхаіл Савіцкі, Міхаіл Пташук, Віктар Тураў;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі БССР, прыняцце Канстытуцыі БССР («развітога сацыялізму»), аварыя на Чарнобыльскай АЭС; рашаць храналагічныя задачы;

выкарыстоўваць гістарычную карту для характарыстыкі гістарычных падзей: дасягненні ў развіцці індустрыяльнага грамадства ў БССР;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: індустрыяльнае грамадства, перабудова, рэабілітацыя; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

выкарыстоўваць фрагменты гістарычных дакументаў для характарыстыкі вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў: пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі БССР; савецкі грамадска-палітычны лад у БССР; фарміраванне ў БССР індустрыяльнага грамадства; дасягненні БССР у развіцці адукацыі і навукі; адлюстраванне гістарычных падзей у творах літаратуры і мастацтва;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: працоўны гераізм народа – хуткае аднаўленне народнай гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны; празмерная хімізацыя сельскай гаспадаркі, Чарнобыльская катастрофа – нарастанне экалагічных праблем;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце; пераводзіць інфармацыю з вербальна-лагічнай у вобразна-наглядную форму і наадварот;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, гістарычных асобах Беларусі з выказваннем уласнага меркавання аб іх значэнні.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні мясцін памяці беларускага народа, выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі і як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўленне камунікацыі ў поліканфесійным і полікультурным грамадстве.

## СТАНАЎЛЕННЕ І ЎМАЦАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. 90-я гг. ХХ – ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ ХХІ ст. (6 гадзін)

Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г. і наданне ёй статусу канстытуцыйнага закона. Белавежскія пагадненні, стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (далей – СНД). Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. і ўвядзенне пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнцкія выбары 1994 г. Рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г. і яго вынікі. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь.

Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 90-х гг. ХХ – першай чвэрці ХХІ ст. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2015 г., 2020 г., 2025 г. Рэспубліканскія рэферэндумы 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г., 27 лютага 2022 г., прынятыя на іх змены і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Асновы дзяржаўнага ладу суверэннай Рэспублікі Беларусь. Усебеларускі народны сход – вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь. Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. і пошук шляхоў выхаду з крызісу. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства. Усебеларускія народныя сходы і іх рашэнні.

Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь. Прынцыпы і шматвектарны характар знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць Беларусі ў ААН. Стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Умацаванне сувязей Рэспублікі Беларусь з краінамі СНД. Утварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза. Узаемаадносіны Беларусі з іншымі краінамі свету.

Развіццё адукацыі і навукі, культуры і спорту. Афармленне дзяржаўнага статусу беларускай і рускай моў. Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі. Дасягненні ў развіцці навукі. Адлюстраванне гістарычнага мінулага і сучаснасці ў творах беларускай літаратуры і мастацтва. Алімпійскія дасягненні спартсменаў Рэспублікі Беларусь.

Урок абагульнення.

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў 1990-я – першай чвэрці XXI ст., іх даты: прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, зацвярджэнне новай назвы нашай краіны і яе дзяржаўных сімвалаў, стварэнне СНД, прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, 15 сакавіка як дзяржаўнае свята – Дзень Канстытуцыі, выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія рэферэндумы, падпісанне Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі, 2 красавіка як дзяржаўнае свята – Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы;

нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці: Рэспубліка Беларусь;

азначэнні гістарычных паняццяў: Белавежскія пагадненні, ідэалогія беларускай дзяржавы, дзяржаўны суверэнітэт, сацыяльна арыентаваная эканоміка, прыватызацыя, рэферэндум, інтэграцыя, Усебеларускі народны сход;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў навукі, культуры, спорту Беларусі ў 1990-я – першай чвэрці XXI ст., вынікі іх дзейнасці і творчасці;

умець:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць: прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, зацвярджэнне новай назвы нашай краіны і яе дзяржаўных сімвалаў, стварэнне СНД, прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія рэферэндумы, стварэнне Саюза Беларусі і Расіі, падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы; рашаць храналагічныя задачы;

выкарыстоўваць гістарычную карту для характарыстыкі гістарычных падзей: дасягненні ў сацыяльна-эканамічным развіцці Рэспублікі Беларусь, дасягненні знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь;

даваць азначэнні гістарычным паняццям: Белавежскія пагадненні, ідэалогія беларускай дзяржавы, дзяржаўны суверэнітэт, сацыяльна арыентаваная эканоміка, прыватызацыя, рэферэндум, інтэграцыя, Усебеларускі народны сход; правільна (у адпаведным кантэксце) выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;

выкарыстоўваць фрагменты гістарычных дакументаў для характарыстыкі вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў: этапы станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, дзяржаўная сімвалы

Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія рэферэндумы і іх вынікі; канстытуцыйныя асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь, напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, развіццё адукацыі і навукі ў Рэспубліцы Беларусь, адлюстраванне гістарычных падзей у творах літаратуры і мастацтва;

вылучаць галоўнае ў вучэбным тэксце, складаць план параграфа або адказу на канкрэтнае пытанне; знаходзіць неабходную інфармацыю ў вучэбным тэксце; пераводзіць інфармацыю з вербальна-лагічнай у вобразна-наглядную форму і наадварот;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, інтэрнэт і іншыя) для падрыхтоўкі і прэзентацыі паведамленняў аб найважнейшых падзеях, гістарычных асобах Беларусі з выказваннем уласнага меркавання аб іх значэнні.

Выкарыстоўваць веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

рашэння асобасна арыентаваных сітуацый і мадэлявання сацыяльных паводзін;

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні мясцін памяці беларускага народа, выставак, музеяў;

фарміравання асобасных адносін да агульначалавечых традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і ідэнтыфікацыі сябе як жыхара Беларусі і як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўлення камунікацыі ў поліканфесійным і полікультурным грамадстве.

Урок «Наш край у 1917 г. – першай чвэрці XXI ст.».

Выніковае абагульненне (5 гадзін).